УДК 94(474/476ВКЛ)«15/16»(092)

Я. С. ГЛІНСКІ

СТВАРЭННЕ І ФУНКЦЫЯНАВАННЕ ЛЕГЕНДЫ АБ ПАХОДЖАННІ ШЛЯХЕЦКІХ РОДАЎ «МАНІВІДАВІЧАЎ» У ВКЛ XVI–XVII стст.

Анализируется процесс оформления общей родовой легенды ряда аристократических родов Великого Княжества Литовского в XVI–XVII вв., прежде всего Глебовичей и Дорогостайских. Данные роды вели свое происхождение от сына великого князя Гедимина Монтвида (Монвида) и его сына или сыновей. Такое родословие не являлось достоверным и имело своей целью возвышение представителей фамилий, относивших себя к «Монивидовичам». Отмечается, что такое возвышение было необходимо, так как в действительности «Монивидовичи» происходили не из самых известных литовских боярских родов. Приписывание себе родословия от Монтвида Гедиминовича и его сына, якобы бывшего виленским воеводой во время великого князя Витовта, позволяло этим родам соответствовать по знатности настоящим потомкам княжеских династий – Рюриковичам и Гедиминовичам.

Ключевые слова: генеалогические легенды; генеалогия; Великое Княжество Литовское; шляхта; социальный престиж; панегирики; интерпретация прошлого; Монивид; Глебовичи; Дорогостайские; происхождение от Гедимина.

In the article the process of the formation of the general patrimonial legend of a number of aristocratic families of Grand Duchy of Lithuania in the XVI–XVII centuries (first of all, the Hlebowiczes and the Dorohostajskis) is analyzed. These families conducted the origin from the son of the Grand Duke Gedimin's Montwid (Monwid) and his son or sons. Such genealogy wasn't reliable and had the purpose the glorification of representatives of these families, belonged to «Moniwid's kin». The author notes that such glorification was necessary for them, because actually «Moniwid's descendants» came from not well known Lithuanian noble families. Attributing genealogy from Montwid Gediminid and his son who allegedly was the palatine of Wilno, allowed these families to correspond on eminence to the real descendants of Ryurik's and Gedimin's dynasties.

Key words: genealogical legends; genealogy; Grand Duchy of Lithuania; szlachta; social prestige; panegyrics; interpretation of the past; Moniwid; the Hlebowiczes; the Dorohostajskis; origin from Gedimin.

У беларуска-літоўскім летапісанні XV–XVI стст. падаецца пералік сыноў Гедыміна, які распачынаецца іменем Мантвід (Манвід)[1]. Гедымінавіча з такім іменем ведае і крытычная гістарыяграфія. Так, польскі гісторык XIX ст. Юзаф Вольф услед за летапісамі лічыў яго старэйшым сынам Гедыміна і сцвярджаў, што ён памёр бяздзетным[2]. Сучасныя даследчыкі Тадэвуш Васілеўскі і Ян Тэнгоўскі таксама залічваюць яго да дзяцей Гедыміна, хоць і не прызнаюць яго прымагенітуру. Акрамя таго, Ян Тэнгоўскі адзначае, што няма звестак пра нашчадкаў гэтага князя, з чаго, аднак, не вынікае, што ён іх не меў[3]. Так ці інакш, з пункту гледжання цяперашняга часу ніякіх дакладных звестак аб паходжанні шляхецкіх родаў ВКЛ ад Мантвіда (Манвіда) няма.

Па-іншаму справа выглядала ў вачах геральдыкаў і панегірыстаў XVI–XVII стст. – яны прыпісвалі Мантвіду (Манвіду) шырокае кола спадкаемцаў. Гэта заўважыў яшчэ Ю. Вольф, адзначыўшы са спасылкай на «Гербы рыцарства польскага» (1584) Барташа Папроцкага, што ад Манвіда выводзіліся Забярэзінскія, Дарагастайскія, Глябовічы і Вяжэвічы[4]. Усе гэтыя роды, паводле Б. Папроцкага, пайшлі ад двух сыноў Манвіда – абодва яны былі ваяводамі віленскімі і мелі імёны Манвід і Мантвід[5].

Узнікненню такога вываду «паспрыяла» існаванне рэальнага віленскага ваяводы пачатку XV ст. з падобным іменем – магутнага баярына часоў Вітаўта Манівіда (у хрышчэнні – Войцеха) Гайлігінавіча (памёр у 1423 г.[6]). Падабенства гучання імёнаў сына Гедыміна і літоўскага баярына, відавочна, магло прыводзіць да іх аб'яднання, што ўжо адзначаў польскі гісторык Збыслаў Вайтковяк[7]. Адным з першых справу «ператварэння» Мантвіда (Манвіда) Гедымінавіча і Войцеха Манівіда Гайлігінавіча ў бацьку і сына ажыццявіў менавіта Б. Папроцкі.

Яго выклад генеалогіі Манівідавічаў заслугоўвае пільнай увагі. Распачынаецца ён спасылкай на «рускіх летапісцаў», якія нібыта сцвярджалі, што «мірны пан» Манвід быў пазбаўлены Альгердам свайго законнага месца вялікага князя і атрымаў ад таго ж Альгерда Кернава і Слонім. Аднак ні летапісы ВКЛ, ні Мацей Стрыйкоўскі не бяруць у разлік Манвіда, калі апавядаюць пра ўнутрыдынастычную барацьбу ў ВКЛ: у іх Альгерд пры дапамозе Кейстута пазбаўляе ўлады Яўнута[8]. Ю. Вольф справядліва адзначыў яшчэ адзін істотны недахоп гэтай генеалагічнай легенды: роды, якія паходзілі ад князя Манвіда, у рэчаіснасці не ўжывалі княжацкага тытула, што было абавязковым для бакавых ліній Гедымінавічаў. Б. Папроцкі разумеў гэты хіб і спрабаваў яго растлумачыць наступным чынам: нібыта Ягайла і Вітаўт не хацелі «з іншых падпарадкаваных сабе братоў сваіх мець князёў, таму перавялі іх на іншыя ўрады»[9] (тут і далей пераклад наш. – *Я. Г.*) – так Манвід і Мантвід сталі віленскімі ваяводамі.

Застаецца, аднак, пытанне, чаму з аднаго гістарычнага Манівіда Б. Папроцкі «зрабіў» двух. Як падаецца, гэта было зроблена з пэўным намерам. З нашчадкаў «створанага» Папроцкім Манвіда Манвідавіча ў час напісання «Гербаў» прыметную ролю адыгрывалі толькі Дарагастайскія (адна з галін роду Аляхновічаў Кухмістровічаў)[10]: іншыя Аляхновічы Кухмістровічы, як і адасобленыя ад іх Іжыковічы, значных пасад не займалі, а Забярэзінскія наогул зніклі яшчэ ў 1533 г.[11] У сваю чаргу, сярод нашчадкаў Мантвіда Манвідавіча на вышэйшых пазіцыях месціліся толькі Глябовічы. Фактычна Б. Папроцкі пра іх і вядзе гаворку[12]. Магчыма, Дарагастайскія і Глябовічы ўсведамлялі няблізкасць свайго паходжання, таму і спатрэбілася аднесці іх супольнага продка ў большую старажытнасць – у часы Мантвіда Гедымінавіча, а не яго ўяўнага сына. Такім чынам, аповед Б. Папроцкага меў на мэце ўзвысіць усе роды, якія ён вывеў ад старэйшага брата Альгерда Манвіда. Гэта перадусім датычыць Глябовічаў, пра якіх геральдык паведамляе вельмі падрабязна.

Аднак легендарнасць выкладу Папроцкага не абмяжоўваецца толькі прыпісваннем гэтых родаў да сына Гедыміна. На самай справе (што таксама ўжо было адзначана Ю. Вольфам[13]), ніводзін з прыведзеных вышэй родаў не з'яўляўся непасрэдным нашчадкам віленскага ваяводы Войцеха Манівіда Гайлігінавіча. Яго род не быў працяглым і ўключаў у сябе сына Івашку (Яна) і ўнукаў Яна і Войцеха, на смерці апошняга з іх у 1475 г. і перарвалася мужчынская лінія гэтага роду[14]. Зрэшты, далучэнне родамі, згаданымі Папроцкім, сябе да Манівідавічаў (і Глябовічы, і асабліва Дарагастайскія актыўна ўжывалі слова «Манівід») не было абсалютна беспадстаўным: яны былі ўключаны ў адну гербавую супольнасць – «Ляліва» і, на думку польскага даследчыка Уладзіслава Семковіча, належалі да больш шырокага гарызантальнага «роду Манівіда»: напрыклад, Аляхновічы і Забярэзінскія былі нашчадкамі Рымавіда, які мог быць крэўным Манівіда, а Вяжэвічы і Глябовічы маглі быць адаптаваны Манівідавічамі ў склад гербавага братэрства ў часы Жыгімонта Кейстутавіча[15].

Асэнсаванне сябе «Манівідамі» мела наступствам перадусім павышэнне прэстыжу родаў. Войцех Манівід з'яўляўся адным з самых уплывовых[16] і заможных[17] літоўскіх баяр часоў Вітаўта. Таксама і яго сын Івашка быў актыўным палітычным дзеячам: троцкі, а пры канцы жыцця і віленскі ваявода, кіраўнік

апазіцыі магутнаму Яну Гаштаўту пры двары вялікага князя Казіміра ў 1450-я гг.[18] Такое мінулае, «вакантнае» пасля знікнення гістарычных Манівідавічаў, магло істотна ўзвысіць і Дарагастайскіх, і Глябовічаў. Асабліва апошніх, чыё паходжанне (русіны-каталікі[19] ці літвіны[20]) і зараз застаецца цьмяным, ды і ў тыя часы, верагодна, не падавалася занадта высакародным.

Такім чынам, родавая легенда Дарагастайскіх і Глябовічаў (а разам з імі Забярэзінскіх, Іжыковічаў, Вяжэвічаў і Рэкуцяў) мела два ўзроўні міфалагізацыі: спачатку аднясенне сябе да роду Гедыміна, а потым да роду Войцеха Манівіда. Узнікае, аднак, пытанне пра час яе паўстання. Барташ Папроцкі, пэўна, не быў яе аўтарам, ён толькі спрабаваў яе ўдакладніць: тлумачыў адсутнасць княжацкага тытула ў нібыта нашчадкаў Гедыміна, «падвоіў» Манівіда, каб вывесці ад яго і Дарагастайскіх, і Глябовічаў.

Так, сам Б. Папроцкі ў раннім творы «Гняздо цноты» (1578) занатаваў больш сціслую і некалькі адрозную генеалогію «Манівідавічаў»[21]. У ёй у Манвіда Гедымінавіча ёсць толькі адзін сын Манвід, ад сыноў якога ідуць адпаведна Глябовічы і Вяжэвічы. Але ў Манвіда Манвідавіча ёсць яшчэ адзін сын – таксама Манвід, ад якога ўжо паходзяць Дарагастайскія, Кухмістровічы і Іжыковічы. Яшчэ адной асаблівасцю выкладу «Гнязда цноты» з'яўляецца тое, што ў ім Дарагастайскія, Кухмістровічы і Іжыковічы выведзены ад Юхны, а не ад Алехны, як гэта зроблена ў «Гербах рыцарства польскага» і было ў рэчаіснасці[22].

Такія адрозненні паміж двума творамі аднаго аўтара можна вытлумачыць. У больш раннім «Гняздзе цноты» Папроцкі перш за ўсё ўганараваў Глябовічаў – яны паходзяць са старэйшай лініі нашчадкаў Манвіда Гедымінавіча (у «Гербах» усё наадварот – больш высокае паходжанне атрымліваюць Дарагастайскія). Акрамя таго, у першым па часе творы геральдык падаў правільную паслядоўнасць Юхны і Алехны «Манівідавічаў» (у рэчаіснасці – Рымавідавічаў) – спачатку Юхна, потым Алехна. Зноў-такі, каб уганараваць Дарагастайскіх і іх крэўных, Б. Папроцкі вывеў іх ад старэйшага Юхны, а зніклых Забярэзінскіх – ад малодшага Алехны. Гэта, аднак, была не вельмі пераканаўчая генеалогія – чаму тады нашчадкі Юхны маюць родавае прозвішча Аляхновічы? Таму ў наступным сваім творы Б. Папроцкі памяняў месцамі Алехну і Юхну. Як бачым, за шэсць гадоў, якія мінулі паміж выхадам першага і другога геральдычнага зборніка Б. Папроцкага, Дарагастайскія істотна «падраслі» ў генеалагічным плане, што, зразумела, не адбылося без іх уплыву.

Цікавасць Дарагастайскіх, асабліва тагачаснага кіраўніка роду ваяводы полацкага Мікалая Дарагастайскага да ўласнага радаводу, можа быць пацверджана і пры разглядзе творчай спадчыны Мацея Стрыйкоўскага, аднымі з мецэнатаў якога маглі з'яўляцца Дарагастайскія[23]. Так, за год да выхаду «Гнязда цноты» Б. Папроцкага, у 1577 г. М. Стрыйкоўскі надрукаваў панегірык у гонар Дарагастайскіх «На герб Ляліва», дзе, услаўляючы Мікалая Дарагастайскага, акцэнтаваў увагу на слаўным мінулым яго продкаў[24]. Так, продак Дарагастайскага адзначыўся ў ваеннай справе ў часы Гедыміна, а ў часы Ягайла і Вітаўта іншы Манівід удзельнічаў у мностве бітваў. Зрэшты, М. Стрыйкоўскі ў панегірыку хоць і адносіць пачаткі слаўнай гісторыі Дарагастайскіх да часоў Гедыміна, прама не гаворыць пра іх паходжанне ад вялікага князя.

Цікава, што ў сваім ненадрукаваным творы «Аб пачатках…» (1570-я гг.) М. Стрыйкоўскі выводзіць услед за «рымскай легендай» летапісаў[25] «Манівідавічаў» ад Гроўжы, «пана раднага» міфічнага літоўскага князя Скірмунта[26]. Пры гэтым у шэрагі нашчадкаў Гроўжы залічаны не толькі прадстаўнікі «роду Манівіда» Дарагастайскія і Глябовічы, але яшчэ і Сноўскія з Пацамі. Заўважым, што ў больш крытычнай «Хроніцы» (1582) М. Стрыйкоўскі ўжо не выводзіў гэтыя роды ад Манівіда, таямніча сцвярджаючы, што «не жадае аб гэтым разважаць»[27]. Магчыма, М. Стрыйкоўскі ўсведамляў легендарнасць таго пераліку нашчадкаў Манівіда, які ён падаў у «Аб пачатках...», і не лічыў неабходным уключаць яго ў сваю новую працу.

«Рымская легенда» як частка летапісаў аформілася ў 1520–30-я гг.[28], з чаго вынікае, што пэўная родавая легенда (альтэрнатыўная легендзе аб паходжанні ад Гедыміна) існавала ўжо тады. Звычайна ў навуковай літаратуры робяцца спробы шукаць повязі легендарнага Гроўжы з гістарычнымі Манівідавічамі[29]. Але да часу паўстання летапіснай «рымскай легенды» гістарычныя Манівідавічы даўно ўжо зніклі. Акрамя таго, яны ў асобе ваяводы троцкага Івашкі Манівідавіча былі палітычнымі праціўнікамі Яна Гаштаўта, унук якога Марцін Гаштаўт лічыцца адным з ініцыятараў стварэння летапіснай «рымскай легенды»[30]. Таму, як здаецца, «рымская легенда» выводзіць ад Гроўжы ўяўных «Манівідавічаў», перадусім, Дарагастайскіх і Глябовічаў. У гэтым рэчышчы варта звярнуць увагу на постаць ваяводы віленскага Яна Глябовіча (памёр у 1549 г.), які, як сцвярджае польскі навуковец XIX ст. Адам Банецкі, лічыў сябе вышэйшым за шматлікіх і часта нязначных уладальнікаў княжацкага тытула[31]. Гэта стасуецца з тым, што шэраг даследчыкаў[32] бачаць адну з задач летапіснай «рымскай легенды» ва ўзвышэнні родаў баярскага паходжання, у тым ліку і над нашчадкамі Гедымінавічаў і Рурыкавічаў.

Такім чынам, назіраецца паступовая трансфармацыя родавай легенды Глябовічаў, Дарагастайскіх і іх крэўных: спачатку яны апелявалі да паходжання ад адданага дынастыі баярскага роду Манівідавічаў. Потым, што адлюстравана перадусім у працах Б. Папроцкага, Дарагастайскія і Глябовічы сталі выводзіцца ад Гедыміна, але не адмовіліся яны і ад спадчыны магутнага ваяводы віленскага Манівіда, якога «падвоілі» і абвясцілі нашчадкам Гедыміна.

Вытокі такой трансфармацыі, на нашу думку, заключаюцца ў наступным. Па-першае, у далейшай «інтэлектуалізацыі» родавай легенды: продкам Глябовічаў і Дарагастайскіх быў Манівід (Манвід, Мантвід), калі ёсць сын Гедыміна з падобным іменем, то паяднаць іх даволі лёгка. Па-другое, першае дакладнае прыпісванне «Манівідаў» да Гедымінавічаў здзейсніў Б. Папроцкі ў 1578 г. (М. Стрыйкоўскі,

якi працаваў у гэты самы час, быў непараўнальна больш асцярожным). Такім чынам, генеалагічнае ўзвышэнне Глябовічаў і Дарагастайскіх над Ягелонамі (Альгеравічамі) адбылося ўжо пасля знікнення дынастыі ў 1572 г. Верагодна, раней (пры жывых Ягелонах) яно падалося б занадта смелым і непаважлівым у дачыненні да манархаў. Украінская даследчыца Н. Якавенка адзначае, што штуршком да з'яўлення родавых легенд «украінскіх» княжацкіх родаў стала Люблінская унія, якая сутыкнула князёў украінскіх зямель (з 1569 г. – частка Кароны Польскай) з польскім палітычным ладам, дзе ва ўмовах шляхецкай роўнасці ім выпадала дзеля ўмацавання свайго прэстыжу звязаць сябе з уладарамі старажытнасці[33]. Родавая легенда «Манівідавічаў» аб паходжанні ад Гедыміна несла тую ж прэстыжную функцыю, але ёй, наадварот, было наканавана ўзвышаць баярскія роды над родамі княжацкімі пры дапамозе далучэння першых да зніклай дынастыі Гедымінавічаў – Ягелонаў.

Далейшыя лёсы родавай легенды «Манівідавічаў» паказваюць, што агульнапрынятым стаў варыянт іх вываду ад Гедыміна. Такі падыход наяўны ў створаным у сярэдзіне XVII ст. «Гербоўніку рыцарства Вялікага Княства Літоўскага» Войцеха Віюка Каяловіча. Праўда, В. Віюк Каяловіч паспрабаваў паяднаць занатаваную Б. Папроцкім версію родавай легенды са звесткамі пра рэальных Манівідавічаў, узятымі перадусім у М. Стрыйкоўскага[34]. Акрамя таго, літоўскі геральдык дапасаваў да свайго тэксту яшчэ і звесткі з «Orbis Polonus» сучаснага яму польскага геральдыка Шымана Акольскага. Той таксама прытрымліваўся «княжацкай» родавай легенды, праўда, пры гэтымператварыў Манвіда Гедымінавіча і Манівіда Гайлігінавіча ўвогуле ў адну асобу[35]. Так ці інакш, але само паходжанне Глябовічаў, Дарагастайскіх і іх крэўных ад Гедыміна не ставілася імі пад сумнеў.

Аднак стварэнне родавай легенды прывяло не толькі да ўзвышэння родаў, якія ў ёй узгадваюцца, але яшчэ і да занядбання памяці пра сапраўдных гістарычных Манівідавічаў. Івашка Манівідавіч, ваявода троцкі, магутны сын магутнага бацькі, добра прадстаўлены на старонках «Хронікі» М. Стрыйкоўскага. Ён, як ужо адзначалася, складае апазіцыю Яну Гаштаўту, дагэтуль, пасля Парчоўскага сойма, адмаўляецца ад польскага герба[36]. У Б. Папроцкага звестак пра яго ўжо не знаходзім. Гэта нельга вытлумачыць толькі тым, што іх род знік, – Б. Папроцкі падае звесткі пра многія роды, якія ўжо да яго часу зніклі, напрыклад пра тых жа Забярэзінскіх. Што датычыцца В. Каяловіча, то ён, дзякуючы М. Стрыйкоўскаму, ведаў пра Івашку Манівідавіча, але паяднаў яго з Юхнам Рымавідавічам, пачынальнікам Забярэзінскіх, а потым яшчэ і зрабіў продкам шляхціцаў Рэкуцяў[37]. Такім чынам, стварэнне і развіццё родавай легенды Дарагастайскіх і Глябовічаў прывяло да паступовага занядбання сапраўднай гісторыі нашчадкаў Манівіда, якім проста не знайшлося месца ў генеалагічным выкладзе легенды.

Родавая легенда Глябовічаў і Дарагастайскіх не засталася толькі здабыткам геральдычных прац. Яна трапіла і на старонкі панегірычных твораў у гонар прадстаўнікоў гэтых фамілій. Ужо ішла гаворка пра панегірык М. Стрыйкоўскага «На герб Ляліва» Дарагастайскіх, але і ўслаўленне Глябовічаў не адбывалася без звароту да сюжэтаў з родавай легенды. Напрыклад, В. Прус у творы «Сенатар у Ясна Вяльможным пане… Мікалаі Глябовічы» (1633) асабліва падкрэслівае, што род Глябовічаў пайшоў ад вялікага князя Гедыміна, «ад якога святы народ Ягайлаў пайшоў»[38]. Такім чынам, выразна акцэнтуецца высокае паходжанне Глябовічаў, іх прыналежнасць да слаўнай дынастыі. Яшчэ больш акрэслены націск на паходжанне ад Гедыміна робіць В. Бяловіч у лацінамоўным панегірыку «Cynthiae Hlebovicianae decora» (1668)[39], дзе гэта паходжанне пастаянна вылучаецца.

Панегірыкі адлюстроўвалі не толькі меркаванні іх непасрэдных аўтараў, але і погляды прадстаўнікоў тых родаў, ва ўшанаванне каго яны былі створаны, таму выпадае адзначыць, што Глябовічы, як і Дарагастайскія, актыўна карысталіся плёнам сваёй родавай легенды, дзякуючы якой яны былі далучаны да знакамітага роду вялікіх князёў літоўскіх Гедымінавічаў.

Такім чынам, шэраг магнацкіх і шляхецкіх родаў у ВКЛ у XVI–XVII стст. (перш за ўсё Дарагастайскія і Глябовічы) актыўна «працавалі» над стварэннем легенды аб сваім паходжанні. Спачатку, што адлюстравана ў беларуска-літоўскіх летапісах і «Аб пачатках...» М. Стрыйкоўскага, яны развівалі «баярскі» варыянт свайго радаводу – ад «пана раднага» Манівіда. Аднак неўзабаве для ўзвышэння над сапраўднымі княжацкімі родамі яны прыпісалі сябе да нашчадкаў сына вялікага князя літоўскага Гедыміна па імені Мантвід (Манвід), тым самым утварыўся больш распаўсюджаны (занатаваны Б. Папроцкім і В. Віюком Каяловічам) «княжацкі» варыянт родавай легенды. У яго выклад, акрамя таго, быў уключаны аповед пра знакамітага ваяводу віленскага пачатку XV ст. Манівіда, які на самай справе не з'яўляўся непасрэдным продкам ні Глябовічаў, ні Дарагастайскіх, ні іншых родаў, якія выводзілі ад яго сваё паходжанне.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1 Гл.: Полное собрание русских летописей. Т. 35. Летописи белорусско-литовские / сост., авт. предисл. и ред. текста Н. Н. Улащик. М., 1980. С. 61.

2 Гл.: Wolff J. Ród Gedimina. Kraków, 1886. S. 10.

3 Гл.: Tęgowski J. Pierwsze pokolenia Giedyminowiczów. Poznań ; Wrocław, 1999. S. 244–245.

4 Гл.: Wolff J. Op. cit. S. 10–11.

5 Гл.: Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego. Kraków, 1858. S. 839–840.

6 Гл.: Petrauskas R. Lietuvos diduomenė XIV a. Pabaigoje – XV a. Sudėtis – struktūra – valdžia. Vilnius, 2003. P. 266.

7 Гл.: Wojtkowiak Z. Maciej Stryjkowski – dziejopis Wielkiego Księstwa Litewskiego. Kalendarium życia i działalności. Poznań, 1990. S. 115.

8 Гл.: Stryjkowski M. Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego : 2 t. Warszawa, 1846. T. 2. S. 2–3.

[9] Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego. Kraków, 1858. S. 839–840.

[10] Гл.: Boniecki A. Poczet rodów w Wielkiem Księstwie Litewskiem w XV–XVI w. Warszawa, 1883. S. 218 ; Semkowicz W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polską w Horodle roku 1413 // Lituano-Slavica Posnaniensia. 1989. T. 3. S. 26.

[11] Гл.: Boniecki A. Op. cit. S. 98–99, 160–161, 395.

[12] Гл.: Paprocki B. Op. cit. S. 842–845.

[13] Гл.: Wolff J. Op. cit. S. 11.

[14] Гл.: Насевіч В. Манівідавічы // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. Т. 2. Кадэцкі корпус – Яцкевіч. Мінск, 2007. С. 270 ; Ochmański J. Moniwid i jego ród // Lituano-Slavica Posnaniensia. 2003. T. 9. S. 17–31 ; Petrauskas R. Lietuvos diduomenė... P. 266–269 ; Semkowicz W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polską w Horodle roku 1413 // Lituano-Slavica Posnaniensia. 1989. T. 3. S. 15–18.

[15] Гл.: Semkowicz W. Op. cit. S. 24.

[16] Гл.: Petrauskas R. Lietuvos diduomenė... P. 266–267.

[17] Гл.: Semkowicz W. Op. cit. S. 17.

[18] Гл.: Ochmański J. Moniwid i jego ród // Lituano-Slavica Posnaniensia. 2003. T. 9. S. 27.

[19] Гл.: Заяц Ю. Глябовічы // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. Т. 1. Абаленскі – Кадэнцыя. Мінск, 2005. С. 540 ; Semkowicz W. Op. cit. S. 24.

[20] Гл.: Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Alekasandra Jagiellończyka. Poznań, 1995. S. 89.

[21] Гл.: Paprocki B. Gniazdo cnoty. Kraków, 1578. S. 1143–1144.

[22] Гл.: Semkowicz W. Op. cit. S. 26.

[23] Гл.: Wojtkowiak Z. Maciej Stryjkowski... S. 114–115.

[24] Гл.: Stryjkowski M. Na herb Leliwę // Andrzeia Fricza Modrzewskiego O poprawie Rzeczypospolitej księgi czwore. Wilno, 1577. (Biblioteka Narodowa (Polska). Zbiory specjalne. Mf. 78572. S. 4).

[25] Гл.: Полное собрание русских летописей… Т. 35. С. 129.

[26] Гл.: Stryjkowski M. O początkach… wywodach, dzielnościach, sprawach rycerskich i domowych sławnego narodu litewskiego, żemojdzkiego i ruskiego. Warszawa, 1978. S. 177.

[27] Stryjkowski M. Kronika polska... T. 1. S. 237.

[28] Гл.: Сушицький Т. Західньо-руські літописи як пам'ятки литератури. Київ, 1929. С. 303 ; Улащик Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. М., 1985. С. 161–162 ; Ючас М. Хроника Быховца // Летописи и хроники : сб. ст. 1973 г. М., 1974. С. 223 ; Ochmański J. Nad Kroniką Bychowca // Studia Źródłoznawcze. 1967. T. 12. S. 157–162 ; Jakubowski J. Studya nad stosunkami narodowościowemi na Litwie przed Unią Lubelską. Warszawa, 1912. S. 46.

[29] Гл.: Ochmański J. Moniwid i jego ród… S. 31 ; Jurkiewicz J. Od Palemona do Giedymina.Wczesnonowożytne wyobrażenia o początkach Litwy. Cz. 1. W kręgu latopisów litewskich. Poznań, 2012. S. 204–206.

[30] Гл.: Ochmański J. Nad Kroniką Bychowca… S. 157–162 ; Łatyszonek O. Polityczne aspekty przedstawienia średniowiecznych dziejów ziem białoruskich w historiografii Wielkiego Księstwa Litewskiego XV–XVI w. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 2006. № 25. S. 20–21.

[31] Гл.: Boniecki A. Op. cit. S. 72.

[32] Гл.: Łatyszonek O. Polityczne aspekty... S. 32 ; Petrauskas R. Socialiniai ir istoriografiniai lietuvių kilmės iš romenų teorijos aspektai // Literatūros istorija ir jos kurėjai. Vilnius, 2004. P. 277.

[33] Гл.: Яковенко Н. Кого топчуть коні звитяжного Корибута: до загадки києво-могилянського панегірика 1648 року «Maiores Wiszniewiecciorum» // Дзеркала ідентичності. Дослідження з історії уявлень та ідей в Україні XVI – початку XVIII століття. Київ, 2012. С. 330–331.

[34] Гл.: Wijuk Kojałowicz W. Herbarz rycerstwa W. X. Litewskiego. Kraków, 1897. S. 132.

[35] Гл.: Okolski S. Orbis Polonus. Cracovia, 1641. T. 2 : L – R. P. 88.

[36] Гл.: Stryjkowski M. Kronika polska... T. 2. S. 232–233, 250–251.

[37] Гл.: Wijuk Kojałowicz W. Op. cit. S. 136.

[38] Prus W. Senator w Jaśnie Wielmożnym Panie... Mikołaiu Hlebowiczu. Wilno, 1633. S. 22.

[39] Гл.: Białowicz W. Cynthiae Hleboviciane decora. Vilna, 1668. P. 2.

Паступіў у рэдакцыю 03.02.2014.

Яўген Станіслававіч Глінскі – аспірант кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў А. У. Любы.